работы музея помогает не только повысить его научный престиж, но и просто набрать большую популярность среди туристов, местных жителей и путешественников, которым интересна подобная тематика.

**Заключение.** В данном исследовании мы попытались показать философскую и историческую сторону работы современного краеведческого музея, особенно акцентируя внимание на специфике работы Городокского краеведческого музея, а также приведя в пример музейные экспозиции других регионов Беларуси. Также мы постарались наиболее емко отразить необходимость существования и развития в современном глобальном мире такого учреждения как краеведческий музей. Ведь именно региональный музей сейчас может показать в Беларуси наиболее плодотворные результаты в области культурных, исторических и природных исследований.

1. Киселев, А. В. Цивилизационный статус краеведческого музея. / А. В. Киселев // Вестник Томского государственного университета. Культурология и искусствоведение. – 2014. – №2. – С. 15-30.
2. Вальтер, Б. О понятии истории. / Б. Вальтер, С. А. // Новое литературное обозрение. – 2000. – №6. – С. 81-90.
3. Бурдо, А. И. Деятельность клуба народных ремесел «Вытокі». Этапы развития и перспективность деятельности / А. И. Бурдо // Молодежь XXI век: образование, наука, инновации: материалы XI Международной конференции аспирантов и молодых ученых, Витебск, 6 декабря 2024 г. – Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова, 2024. – С. 176-178. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/45594 (дата обращения: 26.01.2025).
4. Коледа, И. В. Проблемы философии культуры в белорусской культурологической мысли (конец XIX – начало XXI в.) / И. В. Коледа // Труды БГТУ. – 2023. – №1. – С. 22-26.

## ТЭМА ШТЭТЛА Ў ТВОРЧАСЦІ МАРКА ШАГАЛА

*Л.М. Гефцер*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Яўрэйскае мастацтва XX стагоддзя шмат у чым сфармавала тэма штэтла і ў працах яўрэйскіх мастакоў дадзенага перыяду нярэдка прысутнічае відавочны ці схаваны напамін пра мястэчка рысы аседласці.

У артыкуле «Ці існуе яўрэйскае мастацтва?» даследчык Гаральд Разэнберг піша, што самай сур’ёзнай тэмай яўрэйскай ідэнтычнасці ў мастацтве з’яўляецца праблематыка ўспаміну: «Натуральна, у яўрэяў няма манаполіі на гэту праблему. Але яўрэйскія мастакі адчулі яе асабліва глыбока і непасрэдна. Безумоўна, гэта не яўрэйская праблема; гэта сітуацыя XX стагоддзя, стагоддзя перамешчаных асоб, людзей, якія рухаюцца з аднаго кантэксту ў іншы, і перадаюць памяць» [цыт. па: 1]. Потым мастацтвазнаўца кажа, што мастацкі спосаб асэнсавання рэчаіснасці з’яўляецца самым надзейным. Гэта датычыцца як успрымання ў цэлым, так і перадачы ўспамінаў у драматычным гістарычным кантэксце стагоддзя.

Мэта – абазначыць некаторыя асаблівасці творчасці Марка Шагала, звязаныя з тэмай штэтла.

**Матэрыял і метады.** Матэрыяламі паслужылі працы навукоўцаў, у якіх увага звернута на спецыфіку праяўлення тэмы яўрэйскага мястэчка ў творчасці яўрэйскіх мастакоў XX стагоддзя. У аснову тэзісаў пакладзены апісальна-аналітычны метад даследавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Тэма яўрэйскага мястэчка адыгрывае значную ролю ў мастацтве Марка Шагала і менавіта ён упершыню прывозіць яе на захад. Гэты момант быў адзначаны французскімі мастацтвазнаўцамі Луі Пратам і П’ерам Шнэйдэрам.

Ранняя творчасць мастака інтуітыўна транслюе элементы культуры хасідаў, паколькі ў ёй прайшло яго дзяцінства ў Віцебску і Лёзна. У сваіх працах М. Шагал нярэдка звяртаецца да ўспамінаў дзяцінства і юнацтва. Архітэктурныя матывы Віцебска

становяцца важнымі элементамі кампазіцыі, Шагал робіць на ніх акцэнт як на значных дэталях твора, якія ствараюць пэўны кантэкст.

Звяртаючыся да ўспамінаў, майстар таксама ілюстраваў французскую і рускую літаратуру: творы Луі Арагона, Гіёма Апалінэра, Блеза Сандрара, Мікалая Гогаля. Напрыклад, ствараючы ілюстрацыі да «Мёртвых душ» (1923-1925 гг.), мастак арыентаваўся на свае ўспаміны аб жыцці ў правінцыйным на той момант горадзе Расійскай імперыі, што знайшло адлюстраванне ў гэтай серыі афортаў. У кампазіцыі літаграфічнага плаката «Нядзеля» 1979 г. аб'яднаны два пейзажы: пейзаж Віцебска і Парыжа, паміж якімі знаходзяцца закаханыя. Мастак нярэдка спалучаў тэмы Віцебска і Парыжа, такім чынам паказваючы іх значнасць для ўласнага жыцця і творчасці. Каляровая літаграфія «Прысвячэнне паэтам Б. Сандрару і Г. Апалінэру» 1950 г. змяшчае зварот да свету культуры штэтла, дзе разам існуюць іудаізм і хрысціянства. Майстар нярэдка падкрэсліваў значнасць свайго яўрэйскага паходжання. Каляровая ксілаграфія «У маёй памяці» 1968 г. таксама адлюстроўвае тэму штэтла ў творчасці Марка Шагала, падкрэсліваючы значнасць Віцебска: у цэнтры кампазіцыі вечныя вобразы маці і дзіця, бацькоўскі дом на Пакроўскай.

Наконт тэмы штэтла М. Шагал казаў наступнае: «Вулачкі роднага штэтла, скручаныя, селядцовыя абываццелі, зялёныя яўрэі, дзядечкі, цётачкі. І я ўвесь час іх маляваў. З іншага боку, тады я быў маладзей гадоў гэтак на сто, і я любіў іх, проста любіў. І для мяне гэта было важней, гэта захоплівала мяне больш, чым думка аб тым, што маё прызначэнне – быць яўрэйскім мастаком» [цыт. па: 2, с. 72-73].

**Заключэнне.** Такім чынам, мы прасачылі, як тэма штэтла праяўляецца ў творчасці Марка Шагала ў розныя перыяды часу і абазначылі некаторыя асаблівасці яе праяўлення ў графічных творах майстра. З дапамогай інтуітыўнай трансляцыі элементаў культуры хасідаў і вобразнага мыслення, Шагал нярэдка звяртаецца да гэтай тэмы. Яна з'яўляецца адной з асноўных тэм, да якіх у сваёй творчасці звярталіся яўрэйскія мастакі XX стагоддзя.

1. Разэнберг, Г. Ці існуе яўрэйскае мастацтва? – URL: https://artguide.com (дата звароту: 18.01.2025).
2. Харшаў, Б. Марк Шагал аб мастацтве і культуры / Б. Харшаў. – Масква: Тэкст: Кніжнікі, 2009. – 320 с.

## ИЗ ОПЫТА ПРЕПОДАВАНИЯ УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ «ПЕРСПЕКТИВА» НА АНГЛИЙСКОМ ЯЗЫКЕ ДЛЯ СТУДЕНТОВ-ГРАЖДАН КНР

*Д.П. Глущук*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Одним из показателей эффективной подготовки к будущей профессиональной деятельности в области дизайна, изобразительного искусства или преподавания дисциплин художественно-графического цикла является наличие у студентов навыков перспективных построений. Изучение теории и практики перспективы способствует развитию пространственного воображения, логического и образного мышления, формирует навыки графического изображения различных пространственных композиций. Все это необходимо для успешного освоения базовых принципов рисунка, живописи, композиции, дизайн-проектирования и многих других. Учебная дисциплина «Перспектива» в своем содержании определяет взаимосвязь между научным и творческим подходом к изображению пространства на плоскости. Именно поэтому она включена в учебные планы всех специальностей, обучающихся на художественно-графическом факультете всех форм получения образования. Актуальным является изучение законов перспективных построений и студентами-гражданами Китайской Народной Республики.